УДК 371.39

# ЭТНАГРАФІЧНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ “МОЙ КРАЙ”

**Л.М. Тумель**
ДУА «Сярэдняя школа №28 г. Гродна» ( Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Брыкеля, 11; e-mail: school28@mail.grodno.by)

Анатацыя. Дадзены артыкул прысвечаны ролі музейнай педагогікі ў адукацыйнай прасторы. Распавядае аб удзеле ў этнаграфічнай экспедыцыі “Мой родны край” і значэнні музея ў патрыятычным выхаванні падлеткаў.

Ключавыя словы: музей, спадчына, этнаграфічная экспедыцыя, мой родный край, музейная педагогіка.

# ETHNOGRAPHIC EXPEDITION "MY LAND"

**L.M. Tumel**
GUO "Secondary school No. 28 Grodno" (Republic of Belarus, 230008, Grodno, Brickel str., 11; e-mail: school28@mail.grodno.by)

Summary. This article is devoted to the role of museum pedagogy in the educational space. Tells about participation in an ethnographic expedition” My native land " and the importance of the museum in the patriotic education of teenagers.

Key words: museum, Heritage, ethnographic expedition, my native land, museum pedagogy.

Чалавек не можа жыць па-за сферай духоўных каштоўнасцей. Сення адным з галоўных напрамкаў дзейнасці ўстановы адукацыі з’яўляецца патрыятычнае выхаванне. Без ведання сваіх вытокаў немагчыма па-сапраўднаму палюбіць родны край, яго спадчыну. На ўроках беларускай літаратуры і мовы мы імкнемся далучыць вучняў да захавання народных традыцый. Актыўна выкарыстоўваем элементы музейнай педагогікі.

Выхаванне – гэта працэс, які накіраваны на цэласнае развіццѐ асобы вучня. У падлеткавым узросце фарміруецца сістэма каштоўных адносін да жыцця. Таму вялікую ўвагу мы надаём выхаваўчаму працэсу сярод школьнікаў не толькі на ўроках, але і ў розных пазаўрочных мерапрыемствах.

Музейная педагогіка - вобласць навукі, якая вывучае гісторыю, асаблівасці культурнай адукацыйнай дзейнасці музеяў, метады ўздзеяння на розныя катэгорыі наведвальнікаў, узаемадзеяння музеяў з адукацыйнымі ўстановамі. Яшчэ гэта адна з форм сучасных адукацыйных тэхналогій, якая мае сваю гісторыю і сваю навуковую метадалагічную базу: педагагічная дзейнасць у адукацыйнай установе, якаснае і стабільнае пашырэнне адукацыйнай прасторы, уключэнне ў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

яе максімальна магчымага аб'ему культурнай спадчыны, станаўленне і развіцце высакаякаснага навучання і выхавання падрастаючага пакалення.

Прыярытэтнымі задачамі музейнай педагогікі з'яўляюцца далучэнне навучэнцаў да музея і музейнай культуры з ранняга ўзросту, фарміраванне каштоўнасна-сэнсавай сферы асобы навучэнцаў праз прастору музея. Таксама не менш важныя задачы - актывізацыя пазнавальных здольнасцяў асобы і творчай дзейнасці ў музеі, фарміраванне патрэбнасці ў зносінах з культурнай спадчынай і каштоўнаснага стаўлення.

Прадметнасць, нагляднасць культурнай спадчыны дапамагае ў адукацыйнай прасторы: сістэматызаваныя веды па гісторыі роднага краю лепш засвойваюцца.

Ніколі не знікне вечнае: любоў да маці, павага да бацькоў, жаданне стаць культурным і шырокаадукаваным сучасным чалавекам. Моладзь усё менш і менш ведае аб сваіх каранях, мае смутнае ўяўленне пра абрады, асаблівасці традыцый і свят беларусаў. Каб далучыць падлеткаў і моладзь да культуры роднага краю ва ўстанове адукацыі быў створаны этнаграфічны музей “Спадчына”. Штогод праводзіцца этнаграфічная экспедыцыя “Мой родны край”, якая спрыяе далучэнню шырокага кола вучняў да вывучэння культуры, духоўнай спадчыны свайго народа. Асноўная мэта этнаграфічнай экспедыцыі - фарміраванне духоўна багатай і маральна чыстай асобы вучня, яго актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

Асноўныя экспазіцыі этнаграфічнага музея “Спадчына”: “Бабін кут”, “Народныя рамеслы”, “Ткацтва ”, “Адзенне”, “Вышыўка”. Музейныя фонды складаюцца з двух частак – асноўнага фонду і дапаможнага. Асноўны фонд налічвае больш 200 экспанатаў, дапаможны –190 экспанатаў. Самыя каштоўныя экспанаты асноўнага фонду – гэта андарак (1895 г.), лапці (1921 г.). Выхаваўчая функцыя музейных экспанатаў рэалізуецца праз павагу да мінулага, развіццё патрыятызму, духоўнасці, гістарычнай памяці вучняў.

Удзельнікі этнаграфічнай экспедыцыі сустракаюцца з рознымі людзьмі, народнымі майстрамі, вывучаюць, сістэматызуючы ў адно цэлае матэрыялы з бібліятэчных фондаў па традыцыйнай народнай культуры нашага краю. Такім чынам, быў сабраны вельмі цікавы матэрыял “Народныя святы і абрады Гарадзеншчыны“. Былі распрацаваныі сцэнарыі для правядзення такіх святаў, як “Гарадзенскі кірмаш”, “Саракі”, “Каляды”, “Шчодры вечар”, “Гуканне вясны”,“Зяленыя сняткі”, “Жаніцьба Коміна і інш”. Праведзена не адно

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

адкрытае мерапрыемства. Гэты накінурак дзейнасці – яркі, творчы, вызывае інтарэс і захапленне ў вучняў.

Такім чынам, школьны музей адыгравае вялікую ролю ў фарміраванні музейнай культуры. Менавіта школьны музей становіцца першым музеем у жыцці чалавека. Музей забяспечвае сувязь паміж эпохамі, інтэгруючы мінулае ў сучаснасць. Работа музея садзейнічае ўдасканаленню выхаваўчай работы, духоўнаму росту асобы, развіццю маральных і патрыятычных якасцей, глыбокаму успрыманню нацыянальных каштоўнасцей і традыцый беларускага народа.

ЛІТАРАТУРА

1. Музейная педагогика: цели, задачи, формы образования[Электронный ресурс] Рэжым доступу: https://zaochnik.ru/blog/muzejnaja-pedagogika-tseli-zadachi-formy-obrazovanija/.– Дата звароту 17.03.2022.
2. Сташкевіч, А. Б. Музеі Беларусі / А. Б. Сташкевіч // Беларуская культура сёння: гадавы агляд (2002). – Мінск, 2003. – С. 172–180.
3. Гужалоўскі А.А. Нараджэнне беларускага музея / Гужаловский А.А. Рождение белорусского музея... Манаграфія. — Мінск: НАРБ, 2001. — 124 с

УДК 378.091:378.014.61

## КРИТЕРИИ УСПЕШНОЙ АДАПТАЦИИ ИНОСТРАННЫХ СТУДЕНТОВ В ВУЗЕ

**В.С. Чебан**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
(Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: cheban_viktoria@mail.ru)

Аннотация: В статье рассматривается проблема адаптации иностранных студентов к обучению в высших учебных заведениях Беларуси. Выделяется несколько групп адаптационных проблем студентов-иностранцев.

Ключевые слова: адаптация, студенты-иностранцы.

## CRITERIA FOR SUCCESSFUL ADAPTATION OF FOREIGN STUDENTS IN HIGHER EDUCATION INSTITUTION

**V.S. Chaban**
EI "Grodno State Agrarian University" (Belarus, 230008, Grodno, 28 Tereshkova st.; e-mail: cheban_viktoria@mail.ru)

Summary. The article deals with the problem of adaptation of foreign students to study in higher educational institutions of Belarus. There are several groups of problems of adaptation of foreign students.

Key words: adaptation, foreign students.